ТБЛ
318746

# Беларуская мова 8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2003

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

*Аўтары:*
І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

Рэцэнзенты:
канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

**Беларуская** мова: Дыктанты, пераказы, пераклады:
Б43 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

**УДК 808.26(075.3)**
**ББК 81.2Беи-922**

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Дыктанты, пераказы, пераклады**

**8 клас**

Дапаможнік для настаўнікаў
агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 1/32.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 1669.
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.2000.
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-9?
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

ISBN 985-478-208-5

© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэў», 2002

# ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы»*.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

◇ ◇ ◇

1. Она смеётся. Потом смотрит на меня весёлыми серыми глазами (Ю. Казаков). 2. К старухе Агафье Журавлёвой приехал сын Константин Иванович. С женой и дочерью. Попроведывать, отдохнуть (В. Шукшин). 3. Вечером же у Глеба Капустина на крыльце собрались мужики. Ждали Глеба (В. Шукшин). 4. Глеб же Капустин по-прежнему неизменно удивлял. Изумлял. Восхищал даже (В. Шукшин). 5. Последнее время Алёша стал замечать, что он вполне осознанно любит. Любит степь за селом, зарю, летний день... (В. Шукшин). 6. Через час четвёртый взвод рыл окоп. Полуподковой. В полный профиль. С ходами сообщения в церковь, на кладбище и в опустевший коровник (К. Воробьёв). 7. Ревность прошла, а горечь утраты осталась. Надолго. На всю жизнь (М. Герчик).

**СЛОЎНІК**

попрове́дывать — наве́даць
по-пре́жнему — па-ране́йшаму
изумля́ть — здзіўля́ць, ура́жваць, дзіві́ць

**ЗАДАННІ**

1. Перакласці тэксты на беларускую мову.
2. Падкрэсліць няпоўныя сказы. Вусна ўказаць, якія члены сказа ў іх прапушчаны і па якой прычыне.

# ПРОСТЫ СКАЗ:
## СКАЗЫ З АДНАРОДНЫМІ ЧЛЕНАМІ

# ДЫКТАНТЫ

◆ ◆ ◆

## ПАПЕРАДЖАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Летняя ноч

Ціхі сон ночы лёг над зямлёю. Заснула поле пад чорнаю посцілкаю цьмы. Стары лес перастаў хістацца і махаць касматымі лапамі, стаіць, як заваражаны, па краях поля і дрэмле на месяцы. Хаты зліліся пад адзін чорны плех і патанулі ў цемнаце. Ціха і спакойна.

Люблю я ў гэтакую ночку выйсці адзін на бераг возера, стаць на грэблі каля млына і прыгледзецца да хараства летняй ночы, прыслухацца да яе цішы. Круглы, бліскучы месяц высока стаіць на небе і лье свой бледны, маркотны свет на сонную зямлю і глядзіцца ў спакойнай вадзе возера. А гладкае, бліскучае возера люстрам ззяе на месяцы, і ціха, спакойна, чуць-чуць дрыжаць яго маршчынкі, маленькія хвалі на бледным бляску месяца. Тысячы зорак любуюцца ў ім, дрыжаць, пераліваюцца, як каплі расы пры ўсходзе сонца. Па краях возера разрасліся высокія балотныя травы: аер, чарот, асака. За імі ледзь выразаюцца з цемнаты чорныя фігуры алешын і старых дуплістых верб. Роўны,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спакойны, усю ноч несупынны шум вады, якая сочыцца праз шчыліны заставаў, навявае спакой на душу. (163 словы)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і выпісаць сказы з аднароднымі членамі.
2. Вызначыць від сувязі паміж аднароднымі членамі (злучнікавая ці бяззлучнікавая).
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў гэтых сказах.

### Пачатак восені

Угары над лесам, у прагале, бліпічалі маленькія дробненькія зоркі, усё роўна як свяцілася неба.

Калі Андрэй выйшаў на поле да бульбяных ям, калёсы былі ўжо ў вёсцы — стукалі ціха па каменні на вуліцы. На полі было відней, на ямах вісеў туман, густы, сіні, як дым на балоце за ракой, калі летам гарыць торф. Туман хаваў з вачэй усё поле ля фермы і цягнуўся шырокім хвастом удоўж Загумення да Лазы. Ля Лазы на руні ён вісеў у два рады: на самай зямлі і другой паласой угары — упоравень лесу, белы, што абрус.

Неба на ўсходзе над лесам было бурае, угары над галавой дробныя зоркі ўвачавідкі зніклі — мусіць, на прагал насунулася хмара.

На дарозе ля ям была сухая, цвёрдая зямля, сустракалася каменне і белы, падсохлы за дзень на калючым сонцы сівец, ён шамчэў пад нагамі. Было ціха і цёпла, як летам, і здавалася, што гэтай ноччу кранулася расці трава. (145 слоў)

*Паводле І. Пташнікава*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце аднародныя акалічнасці.
2. Вызначыць тып сувязі паміж імі (злучнікавая ці бяззлучнікавая).
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.



## КАМЕНЦІРАВАНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### У грыбы

Назаўтра Васіль пайшоў у грыбы. Перамяніўся дашчэнту лес дзяцінства. Крочачы пясчаным шляхам, Васіль амаль нічога не пазнае.

Там, дзе на вёрсты цягнуліся сасновыя пасадкі, маладнякі з пясчаным, пакрытым верасам долам, цяпер падняліся сапраўдныя бары. Васіля найбольш і ўразілі гэтыя бясконцыя бары з іх урачыстай цішынёй, спакоем, сіняватымі паласамі святла, якія вісяць між медных стваловў. На няўдобіцы, жаўтапёсах выраслі стромкія сосны, спляліся наверсе шатамі. Дол у прагалах між дрэвамі, нібы дыванам, зарос сярэбранымі мхамі.

Вандруючы па імхах, Васіль пачаў натрапляць на баравікі. Яны былі відаць здалёк, выгляд мелі адменны: з бурымі каптурыкамі, моцнымі цвёрдымі ножкамі. На ножках таксама быў буравата налёт. У дзяцінстве на гэтых мясцінах такіх грыбоў Васіль не знаходзіў. Але прыгажэйшага бору, чым гэты, родны, які вырас за час яго адсутнасці, за ўсё сваё жыццё Васіль не бачыў... (129 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце сказы з аднароднымі членамі і падкрэсліць іх.
2. Вызначыць прыметы іх аднароднасці.
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.

### Наш славуты суайчыннік

Скарына глядзіць на нас праз глыбіню стагоддзяў з 1517 года. На ім — доктарская мантыя, берэт, з-пад якога выбіваюцца густыя доўгія валасы. Ён сядзіць у нізкім крэсле перад пюпітрам, трымаючы ў правай руцэ пяро, на момант як бы адарваўшыся ад кнігі,



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

што разгорнута перад ім. Справа ад яго стаіць на падстаўцы другая кніга. З пюпітра звісае вузкі абрус з арнаментам і махрамі. На абрусе — вялікі герб, які можна ўбачыць і на іншых Скарынавых гравюрах: сонца, прыслоненае маладзіком...

Не святар, а чалавек навукі глядзіць на нас з партрэта. Гэта асветнік, які мае на мэце сваёю працаю — выданнем кніг — прынесці карысць людзям простым... І таму паабапал Скарыны розныя астранамічныя, навуковыя прылады, кнігі, пясочны гадзіннік, збан для фарбаў, свечка з рэфлектарам і як знак руплівасці — пчала. А ўнізе на чорнай табліцы зграбнаю вяззю выпісана «Доктар Францыск Скарына». (136 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і запісаць сказы з аднароднымі дзейнікамі і дапаўненнямі.
2. Вызначыць від сувязі паміж імі (злучнікавая ці бязэлучнікавая).
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.
4. Назваць, якія запазычаныя словы сустрэліся ў тэксце. Вызначыць іх лексічнае значэнне.

## ТЛУМАЧАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Партызаны

Разгортваўся ў раёне патрызанскі рух, і ўсё горла станавілася гітлераўцам. Цяпер па шашы яны не ездзілі па адным. Адразу ішла цэлая калона. Спераду бранявік або лёгкі танк, за ім — аўтамашыны, а ў хвасце — яшчэ адзін бранявік. Для аховы. На гаспадарчыя аперацыі, а іншымі словамі, гвалтоўна адбіраць у насельніцтва хлеб і жывёлу, акупанты таксама адпраўляліся толькі калонай.

Нельга сказаць, што такія перасцярогі вельмі ўжо стрымлівалі партызан. Яны міціравалі шашу, наладжвалі засады і абстрэльвалі калоны, і гітлераўцы ў глыбокім тыле адчувалі сябе не лепш, чым на фронце. Больш за ўсё баяліся акупанты нападу на гарнізоны. Практыка паказала, што партызаны ўмеюць гэта рабіць. Дваццаць-трыццаць мінут шквальнага агню, некалькі гранат у нямецкія і паліцэйскія казармы, і гарнізон — нібы карова языком злізала. Так было з Багушэвічамі, так было з Поплавам, так было з Камен-Боркам, Загаллем, Пагостам. (132 словы)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце сказы з аднароднымі членамі і падкрэсліць іх. Вызначыць прыметы іх аднароднасці.
2. Вызначыць від сувязі (злучнікавая ці бязэлучнікавая)
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі

## ТВОРЧЫЯ ДЫКТАНТЫ

◇ ◇ ◇

У старажытных майстэрнях пісьма — скрыпторыях — адбываецца падзел працы. Сярод перапісчыкаў вылучаўся той, каму найлепш удаваліся каляровыя ініцыялы, другому — рубрыкі, трэцяму — мініяцюры, чацвёрты набіваў руку, робячы пераплёты. А ўсё гэта разам павышала мастацкі ўзровень кнігі, бо кожную рэч тут рабіў майстар сваёй справы, ды і скарачаўся час выхаду кнігі. А калі якую кнігу трэба было перапісаць асабліва хутка, то яе дзялілі на часткі і раздавалі некалькім перапісчыкам. Перавагі такой сумеснай працы відавочныя. Нездарма ж кажуць, грамада — вялікі чалавек.

Каб убачыць, як даўней «выдавалася» кніга, на момант зойдзем у сярэдневяковую майстэрню пісьма.

Толькі ўмова: не размаўляць. Майстэрня пісьма — гэта пакой цішыні. (99 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЗАДАННІ**

1. Даць загаловак тэксту.
2. Запісаць працяг тэксту, уключыўшы ў яго апісанне старажытнай майстэрні пісьма, выкарыстоўваючы сказы з аднароднымі членамі.

◇ ◇ ◇

Ціха шумелі над галавой стромкія прыгажуні елкі, таямніча шапацелі пад імі маладыя расахатыя дубкі. Рэдкія павевы ветру прыносілі густы пах багуну і балотнага моху. Было сыравата і змрочна. Над самымі вершалінамі лясных веліканаў плылі і плылі бясконцай чарадой нізкія, набрынялыя дажджом хмары.

Якімка стаяў-стаяў і, не ведаючы, чым яшчэ заняцца, вырашыў агледзець партызанскі лагер да канца. Карцела паглядзець, а што там, у меншых зямлянках, якія яны. Доўга не думаючы, ён пайшоў да бліжэйшай, спусціўся на тры прыступкі і пацягнуў дзверы. (81 слова)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННІ**

1. Закончыць апісанне партызанскага лагеру.
2. Знайсці і падкрэсліць у тэксце аднародныя выказнікі.
3. Даць загаловак тэксту.

## ВОЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Надыход зімы

Вось падзьмуў сівер, і папаўзлі па небе снегавыя хмары, сівыя, лёгкія, як дым, халодныя, непрыветныя, і завалаклі ўсё неба. Вось, ціха лётаючы па ветры, закружыўся белы, лёгкі пушок, камячок снегу, перавярнуўшыся некалькі разоў, памкнуўся з аднаго боку ў другі, як бы выглядаючы лепшае месца, і



нячутна лёг на мёрзлую зямлю. За ім паказаўся другі, трэці, і ўсё часцей, усё гусцей залёталі гэтыя белыя, халодныя матылёчкі зімы і пасыпаліся на зямлю. І як жа многа іх закружылася ў небе! Аж пабялела паветра, і белая сетка сплятаецца з іх. Валяць і валяць белыя сняжынкі, адзін аднаго пераганяюць гэтыя харошанькія камячкі, зляпліваюцца ў паветры і кладуцца на зямлю. Борзда бялее зямля. Снег роўнаю плёнкаю кладзецца на хаты, на гумны, на парканы, на платы, на шулы, на ўсё, што ні сустрэне прад сабою. (129 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы канструкцыі з аднароднымі членамі, звязанымі рознымі відамі сувязі.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку з аднароднымі членамі.

## ВЫБАРАЧНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Спякотны ліпень

Даўно-даўно ішоў дождж. Неба чыстае, як шкло. Сонца ўвесь дзень пячэ **неміласэрна**. Глянем на поле, на луг, на лес. Туман, смуга сіняватага колеру вісіць над усім. Увесь божы свет як бы заслаўся нейкім дымам. Збожжа без пары жоўкне ў полі. Каласы на ніве пасохлі і нудна калышуцца па ветры. Грэчка апусціла лісце, як апараная гарачай вадою. Усё павяла, папрышчылася на сонцы. Вада ў рэках абмялела. Кепска цяпер і расліне, і жывёле, і рыбцы. Нудна пазірае чалавек на гарачае неба, ці не відаць дзе хмурынкі, ці не нагоніць часам вецер дажджлівых хмар. Але неба застаецца чыстым, гладкім, гарачым і **непрыступным** для просьбы чалавека і прыроды. Аратай без надзеі пазірае на поле, дзе гібее яго праца. Толькі слупы чорнага і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сівога дыму відаць то там, то сям над лесам, ды неба ўночы чырванее ад далёкіх пажараў. (135 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і выпісаць з тэксту рады аднародных членаў, злучаных злучнікавай і бяззлучнікавай сувяззю.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.
3. Зрабіць словаўтваральны разбор выдзеленых слоў.

### Рака дзяцінства

А якія цудоўныя травы раслі на заліўных лугах! Балота ў нас па сутнасці было мала, толькі ля Шумінак, вунь ля таго лясочка. Лучкай мы тую балаціну называлі. А так усюды былі заліўныя лугі, якія абсалютна не мелі патрэбы ў асушэнні. А колькі было рыбы! Памятаю, адзін каваль зрабіў цераз рэчку дубовую кладку, акаваў яе жалезам, каб вада не знесла, бо яму кожны дзень трэба было хадзіць у Перавоз у кузню на работу. Вось гэтая кладка і была ў маленстве маёй любімай мясцінкай. Прыйду раніцай, лягу на кладцы, сцішуся і праз шчыліну гляджу ў рэчку. Вада чыстая, светлая, відаць кожная пясчынка на дне. На пясчаным дне поўзаюць паласатыя акуні, вялікія і малыя, адны чорныя, другія шэрыя, а іншыя нейкія жаўтлявыя. Паміж акунёў шмыгаюць рабаватыя печкуры. А колькі было плотак, чырванапёрак! Як выйдуць на чыстае з-за сітніку, як падымуцца на паверхню, то чырванее ўся рэчка. На глыбокіх ямах раскашавалі шчупакі. (148 слоў)

*Паводле В. Дайліды*

**ЗАДАННІ**

1. Выпісаць сказы з аднароднымі выказнікамі.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.



## ДЫКТАНТ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Старажытныя скрыпторыі

У старажытных скрыпторыях з ранку да вечара, праз увесь светлавы дзень, перапісчык старанна выводзіў літару за літараю, адольваючы радок за радком доўгія кіламетры лінеек новай кнігі. Уночы, калі ўжо цьмяная лампада не давала перапісчыку дастаткова святла, час таксама не марнаваўся. Манастырскае начальства знаходзіла новую працу. Тады вычытвалі тэкст кнігі, якую меліся перапісваць, выпраўлялі розныя памылкі, недакладнасці, каб яны не перайшлі ў новы рукапіс. Або звяралася ўжо напісанае.

А наставаў новы дзень, і зноў пад глухімі скляпеннямі чуўся скрып пісьмовых прылад. У скрыпторыі кожны перапісчык звычайна меў ўсё неабходнае пад рукою, каб без патрэбы не хадзіць і не размаўляць. Нішто не павінна было адцягваць тут ад працы.

Ад напружання вочы засцілала імгла, пальцы зводзіў курч, яны не хацелі слухацца, балела плячо. А перапісчык пісаў і пісаў... (125 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Завучыць тэкст і запісаць яго па памяці.
2. Падкрэсліць аднародныя члены, растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

## ДЫКТАНТ «ПРАВЯРАЮ СЯБЕ»

### Вялікі беларус

Жыццё Скарыны прасякнута верай у вялікія магчымасці чалавека. Услаўленню яго прыгажосці, ягонай дзейнасці, валявой натуры прысвячаюць свае

5 Зак. 1669



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вялікія творы Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэль, Тыцыян. Адначасова прачынаецца цяга да ўсёй, не абмежаванай царкоўнымі догмамі, вялікай культуры мінулага. Нездарма і называюць гэтую эпоху Адраджэннем...

Падуя, як адзначаюць даследчыкі, знаходзілася на скрыжаванні вялікіх міжнародных шляхоў. Купцы з сярэдняй Еўропы кіравалі сюды свае абозы, едучы ў Рым — гэты «вечны горад». Сюды ж, праз Падую ў Рым, выпраўляліся, каб пацешыць свой гонар славутаю вандроўкай, розныя князі, магнаты. Тлумы набожных, молячыся, ішлі праз горад таксама ў Рым — да папы, каб атрымаць збавенне ад сваіх грахоў. Царква ласкава за высокую плату адпускала ім не толькі ўсе іх цяперашнія грахі, але нават і тыя, якія яны яшчэ — спадзявалася — зробяць у будучым... Ратуючыся ад цемрашальства, фанатызму царквы, уцякалі сюды і розныя навукалюбцы, якія тут адчувалі сябе куды вальней. (140 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці і падкрэсліць аднародныя члены. Вызначыць прыметы іх аднароднасці.
2. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку паміж імі. Праверыць сябе.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Кірмаш

Была нядзеля. Выхадны дзень.

Да вайны ў такія дні ў Перавоз з'язджаліся людзі з усіх навакольных вёсак. Падводы запруджвалі ўсю плошчу. Стракаты гаманлівы натоўп расцякаўся па вуліцах. Людзі заходзілі ў магазіны, выбіралі посуд, тканіны, прымяралі абутак, касцюмы, шапкі. На рынку ішоў бойкі гандаль. Прадавалі ўсё, чым толькі



багатая была калгасная вёска. На шматлікіх падводах можна было ўбачыць і ладнага парсюка, які, уткнуўшыся ружовым пятачком у духмянае сена, самазадаволена рохкаў, і самаробныя ліпавыя лыжкі з прыгожымі ўзорамі на ручках, і капусную расаду, і гірлянды вэнджаных каўбас, якія апетытна пахлі часнаком, і звязкі пругкіх бярозавых венікаў, і падсушаныя трохкутнікі сыроў... Выбірай, што душа жадае. (102 словы)

*Паводле Я. Курто*

**ЗАДАННЕ**

1 в. — падкрэсліць у тэксце аднародныя выказнікі.
2 в. — падкрэсліць у тэксце аднародныя дапаўненні.

### Куцця

Вось і Каляды недалёка. Чакаюць дзеці гэтага свята, а найбольш — першай куцці. Прыйшла і куцця. За дзень да куцці ў хатах прыбіраюць, мыюць сталы, лавы, вокны. Куцця — важны дзень, адзін раз у год бывае, трэба ж сустрэць яго хараша. Хлопцы яшчэ за тыдзень да Каляд пачынаюць рабіць зоркі.

Самы важны момант у калядныя святы — гэта куцця, або калядны вечар. Уся сям'я стараецца сабрацца ў хату ў гэты вечар. Усё, што не патрэбна ў хаце да свята, выносіцца ў сені або ў камору. Нават на комінку не расклалі агню, як у буднія дні, а запалілі лямпу. Гаспадыня ўходжваецца каля печы. Уся лава каля дзвярэй завалена ўсякімі прыпасамі. Тут стаяць і тараны, і селядцы, і мак, завязаны ў торбачку, і сухія грыбы. Яшчэ звечара запалілі ў печы. Звіняць патэльні аб прыпек, пішчыць цеста на гарачай печы, і аладкі, як грушы, кідаюцца на зэдлік, засланы чыстым белым абрусам. (145 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест


*Прадмова* .......................................... 3

**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**

ДЫКТАНТЫ .......................................... 7

Папераджальны дыктант .......................................... 7
Каменціраваны дыктант .......................................... 8
Творчы дыктант .......................................... 9
Вольны дыктант .......................................... 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» .......................................... 10
Дыктант «Правяраю сябе» .......................................... 11
Выбарачныя дыктанты .......................................... 12
Кантрольны дыктант .......................................... 12

ПЕРАКАЗЫ .......................................... 13

ПЕРАКЛАДЫ .......................................... 20

Пераклад-пераказ .......................................... 29

**СКАЗ**

ДЫКТАНТЫ .......................................... 33

Папераджальныя дыктанты .......................................... 33
Каменціраваныя дыктанты .......................................... 34
Тлумачальны дыктант .......................................... 36
Вольны дыктант .......................................... 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» .......................................... 37
Дыктант «Правяраю сябе» .......................................... 39
Выбарачны дыктант .......................................... 40
Кантрольныя дыктанты .......................................... 40

ПЕРАКАЗЫ .......................................... 42

ПЕРАКЛАДЫ .......................................... 49

Пераклад-пераказ .......................................... 50

**ПРОСТЫ СКАЗ: двухсастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ .......................................... 53

Папераджальны дыктант .......................................... 53
Каменціраваны дыктант .......................................... 54
Тлумачальны дыктант .......................................... 54
Творчыя дыктанты .......................................... 55
Вольныя дыктанты .......................................... 56
Выбарачныя дыктанты .......................................... 60
Дыктант «Пісьмо па памяці» .......................................... 61
Дыктант «Правяраю сябе» .......................................... 62
Кантрольныя дыктанты .......................................... 63

ПЕРАКАЗЫ .......................................... 66

ПЕРАКЛАДЫ .......................................... 74

**ПРОСТЫ СКАЗ: аднасастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ .......................................... 91

Папераджальны дыктант .......................................... 91
Каменціраваныя дыктанты .......................................... 92
Тлумачальны дыктант .......................................... 93
Творчы дыктант .......................................... 94
Вольны дыктант .......................................... 94
Выбарачны дыктант .......................................... 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» .......................................... 96
Дыктант «Правяраю сябе» .......................................... 97
Кантрольныя дыктанты .......................................... 97

ПЕРАКАЗЫ .......................................... 99

ПЕРАКЛАДЫ .......................................... 107

**ПРОСТЫ СКАЗ: няпоўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ .......................................... 109

Папераджальны дыктант .......................................... 109
Каменціраваны дыктант .......................................... 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» .......................................... 110
Дыктант «Правяраю сябе» .......................................... 111
Кантрольныя дыктанты .......................................... 112

ПЕРАКАЗЫ .......................................... 113

ПЕРАКЛАДЫ .......................................... 119

**ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з аднароднымі членамі**

ДЫКТАНТЫ .......................................... 121

Папераджальныя дыктанты .......................................... 121
Каменціраваныя дыктанты .......................................... 123
Тлумачальны дыктант .......................................... 124
Творчыя дыктанты .......................................... 125
Вольны дыктант .......................................... 126
Выбарачныя дыктанты .......................................... 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» .......................................... 129
Дыктант «Правяраю сябе» .......................................... 129
Кантрольныя дыктанты .......................................... 130

ПЕРАКАЗЫ .......................................... 132

ПЕРАКЛАДЫ .......................................... 140


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі


ДЫКТАНТЫ ........................................ 146

Тлумачальны дыктант ........................................ 146
Вольныя дыктанты ........................................ 147
Выбарачны дыктант ........................................ 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 149
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 150
Кантрольны дыктант ........................................ 151

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 152

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 157


## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі


ДЫКТАНТЫ ........................................ 162

Папераджальны дыктант ........................................ 162
Каменціраваны дыктант ........................................ 163
Тлумачальны дыктант ........................................ 164
Вольныя дыктанты ........................................ 164
Выбарачныя дыктанты ........................................ 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 167
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 168
Кантрольныя дыктанты ........................................ 169

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 171

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 179


## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ


ДЫКТАНТЫ ........................................ 192

Папераджальныя дыктанты ........................................ 192
Каменціраваны дыктант ........................................ 193
Творчы дыктант ........................................ 194
Вольны дыктант ........................................ 195
Выбарачны дыктант ........................................ 195
Кантрольны дыктант ........................................ 196

ПЕРАКАЗЫ ........................................ 197

ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 204

Пераклады-пераказы ........................................ 206


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ